ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985
24
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 3 (1453)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА*

### Бюро парткома

на чарговым пасяджэнні абмяркавала ход падрыхтоўкі партыйнай арганізацыі універсітэта да святкавання 40-годдзя Перамогі.

У. УЛАДЗІМІРАЎ.

### На падрыхтоўчым факультэце

для замежных грамадзян адбылося пасяджэнне клуба рускай мовы на тэму «Беларусь мая, сінявокая». У госці да студэнтаў прыйшлі ўдзельнікі фальклорнага ансамбля сярэдняй школы № 3 г. Мінска. «Будзем сябраваць!» — так вырашылі студэнты і госці.

І. ШАШЛЫНАВА,
выкладчык падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян.

### Камісія

па падрыхтоўцы універсітэта да святкавання 40-годдзя Вялікай Перамогі разгледзела работу гістарычнага факультэта і студэнцкага клуба па патрыятычнаму выхаванню студэнцтва. З дакладамі выступілі дэкан гістарычнага факультэта І. О. Царук, дырэктар студэнцкага клуба У. М. Макарэвіч.

Ю. КАЎТУНЕНКА,
С. БАЛЦЭВІЧ,
студэнты факультэта журналістыкі.

### Да навукова-практычнай канферэнцыі

«Героіка-патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі», прысвечанай 40-годдзю Перамогі, рыхтуецца факультэт павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў сярэдніх і спецыяльных навучальных устаноў. Дэканат факультэта запрашае прыняць удзел у канферэнцыі ўсіх студэнтаў і выкладчыкаў універсітэта.

М. ДРОЗД,
дэкан ФПК.

## САРДЭЧНА ВІНШУЕМ!

Паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі:

А. М. БОБР — кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік прафесар В. С. Сцёпін;

Ф. С. ПРЫХОДЗЬКА — кафедра навуковага камунізму, навуковы кіраўнік дацэнт В. В. Бянькоўскі;

А. І. КУМАЧОЎ — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік дацэнт Я. В. Петушкова;

У. Р. КВАЧОНАК — кафедра ЭММ, навуковы кіраўнік прафесар А. Ф. Чарняўскі;

Л. Д. ЕРАВЕНКА — ФПМ, навуковы кіраўнік прафесар Ф. М. Кірылава;

Сціль Камара МАХАМЕД — ФПМ, навуковы кіраўнік дацэнт Ю. Б. Сыраід;

А. Я. ТРАЛЕ — механіка-матэматычны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар А. С. Фядэнка;

І. І. БАГДЗЕЛЬ — геафак, навуковы кіраўнік прафесар В. П. Якушка;

Ю. А. БЛАШКОЎ — гістфак, навуковы кіраўнік прафесар І. В. Аржахоўскі;

Т. Л. СУРЫН — ФПМ, навуковы кіраўнік прафесар Ю. С. Багданаў;

Г. А. РАМАНЮК — механіка-матэматычны факультэт, навуковы кіраўнік дацэнт А. І. Калінін;

І. В. ДРАЖЫНА — юрфак, навуковы кіраўнік прафесар А. В. Дулаў;

М. А. БАБІЙ — юрфак, навуковы кіраўнік прафесар І. С. Цішкевіч;

А. І. ЛЯЎКОВІЧ — кафедра марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, навуковы кіраўнік дацэнт Я. В. Петушкова;

В. А. ПРОКАШАВА — механіка-матэматычны факультэт, навуковы кіраўнік прафесар М. А. Лукашэвіч;

У. П. КАЛОША — НДІ ФХП, навуковы кіраўнік дацэнт А. П. Хапалюк.

Жадаем

*УНІВЕРСІТЭТ НА ВЫСТАЎКАХ*

## ПАТРАБУЕЦЦА ТВОРЧАСЦЬ

МІНУЛЫ ГОД стаў знамянальным для многіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. За эфектыўную прапаганду дасягненняў універсітэцкай навукі 32 чалавекі адзначаны медалямі і дыпломамі ВДНГ СССР і БССР, граматамі і падзякамі МінВНУ БССР, 12 супрацоўнікам уручаны ганаровыя пасведчанні ўдзельнікаў ВДНГ СССР.

За актыўны ўдзел у выстаўцы «Універсітэты — вядучыя вучэбна-метадычныя і навуковыя цэнтры краіны» БДУ удастоены дыплома І ступені ВДНГ СССР.

Шырокі дыяпазон даследванняў універсітэцкіх вучоных. Радуе тое, што многія іх напрамкі былі шырока прадстаўлены на міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх выстаўках. Напрыклад, загадчык кафедры фізікі паўправаднікоў В. Ф. Стэльмах удастоены залатога медаля ВДНГ СССР за распрацоўку прынцыпаў пабудовы малагабарытных спектрометраў ЭПР. Прафесар Я. П. Пятраеў атрымаў сярэбраны медаль за навуковую распрацоўку метадаў ачысткі сцёкавых вод прамысловых вытворчасцей. Сярэбранага медаля ўдастоены дацэнт В. П. Ляхновіч за распрацоўку спецкурсаў па «Асновах экалогіі і ахове навакольнага асяроддзя».

На выстаўцы, прысвечанай 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якая праходзіла на ВДНГ БССР, дыплома ІІ ступені ўдастоена прылада для зняцця дыяграм накіраванага выпраменьвання паўправадніковых крыніц, распрацаваная супрацоўнікамі кафедры электрафізікі.

Паспяхова дэманстраваў універсітэт свае дасягненні і на міжнародных выстаўках. На міжнародным кірмашы ў горадзе Заграбе (Югаславія) экспанавалася навучальная сістэма АТНС-БДУ, а на выстаўцы «Навука, тэхніка і эканоміка БССР» (Чэхаславакія)— лічбавы радыёізатопны шчыльнамер. За актыўную прапаганду дасягненняў універсітэцкай навукі на міжнародных выстаўках і кірмашах пісьмом-падзякай МінВНУ СССР адзначаны супрацоўнікі лабараторыі тэрмадынамікі нафтахімічных працэсаў і СКТБ з ВВ.

Многа выставак чакае нас і ў гэтым годзе. На ВДНГ БССР універсітэт разам з інстытутамі і СКТБ з ВВ рыхтуе экспазіцыю ў гонар 40-годдзя Перамогі. Ужо зараз плануюцца экспанаты на міжнародную выстаўку «Савецкія вынаходніцтвы», якая адкрыецца ў чэрвені гэтага года ў Югаславіі.

Аддзел інфармацыі БДУ імя У. І. Леніна запрашае выкладчыкаў і супрацоўнікаў прыняць актыўны ўдзел у выстаўках гэтага года.

С. ПАВАЛЯЕЎ,
А. ПАДАЛКА,
супрацоўнікі аддзела навукова-тэхнічнай інфармацыі.

*РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!*



ЗНАЕМЦЕСЯ: ГАЛІНА ЛАХЦЕЕВА, студэнтка пятага курса геаграфічнага факультэта.

— Калі зацікавілася геаграфіяй? Як толькі пачала вывучаць яе ў школе. Чаму? Любіла птушак, звяроў і больш за ўсё цікавілася тым, чаму іншы раз прырода «добрая», а іншы раз «злосная». Любоў да гэтага прадмета прывіла школьная настаўніца Галіна Якаўлеўна Каўрыга, чалавек чулы, вельмі ўлюбёны ў геаграфію.

Закончыла Галіна школу і адразу, не задумваючыся, падала дакументы на геаграфічны факультэт. Зараз у яе за плячыма ўжо амаль пяць гадоў студэнцкага жыцця. І ўвесь гэты час Галіна вучыцца на выдатна.

— Галя, яшчэ існуе такое меркаванне, што для студэнта галоўнае — вучоба, а без грамадскай дзейнасці можна абысціся...

— Я не згодна. Грамадская дзейнасць проста неабходна кожнаму студэнту. І вось чаму. Па-першае, яна робіць чалавека больш адказным, больш патрабавальным да сябе, па-другое, яна робіць жыццё больш цікавым. Адчуваеш, што ты патрэбен людзям.

Грамадская дзейнасць Галіны пачалася яшчэ ў школе. Не стаяла яна ў баку ад яе і ва універсітэце. Доўгі час была сакратаром камітэта камсамола факультэта.

— Цяжка было добра вучыцца і добра працаваць?

— Вядома. Не хапала вопыту работы. Звярталася за дапамогай у камітэт камсамола універсітэта, у партыйнае бюро, дэканат факультэта. Іншы раз не было падтрымкі з боку рабят. А гэта так неабходна! Былі моманты, калі хацелася ўсё кінуць, калі апускаліся рукі. Гаварыла сама сабе: «Хопіць! Зраблю ў апошні раз і больш не буду». Але дастаткова было заняцца справай, убачыць агеньчык зацікаўленасці ў вачах рабят, як зноў з'яўлялася жаданне працаваць. Галоўнае ў такой рабоце — да кожнага чалавека падыходзіць з пазіцый чалавечых, а не толькі дзелавых.

Выдатна вучыцца, займаецца грамадскай дзейнасцю, здавалася б, і часу вольнага ў яе не павінна быць. Але Галіна ўмее размеркаваць час так, каб можна было паслухаць Баха і Бетховена, пачытаць Льва Талстога, схадзіць у паход. А летам мінулага года яна ў саставе інтэрнацыянальнага студэнцкага атрада імя Лілі Карастаянавай пабывала ў Балгарыі.

«У мяне невытлумачальная любоў да геаграфічнай карты»,— успомніліся словы Галіны. Здаецца, што любоў гэта зусім зразумелая. Вызначаецца яна жаданнем любіць людзей, родную прыроду, імкненнем атрымаць як мага больш ведаў, каб быць карысным грамадству.

Н. ПАХОМАВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

НА ЗДЫМКУ: Галіна Лахцеева.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

## КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# Тыдзень даўжынёю ў семестр

ЗДАВАЛАСЯ, тым экзаменам не будзе канца. Але яны, уступныя, як і ўсе іншыя экзамены, таксама закончыліся. Атрымана доўгачаканае паведамленне аб тым, што «загадам па ВНУ № ... ад ... Вы залічаны студэнтам першага курса факультэта журналістыкі БДУ». Радасці няма мяжы, і толькі пасля шматразовага перачытвання гэтай паперы сябрам, суседзям і знаёмым я заўважаю ў канверце яшчэ адну паперу: «Паважаны першакурснік! Камітэт камсамола БДУ імя У. І. Леніна віншуе цябе з паступленнем у нашу ВНУ. Нагадваем: табе набходна зняцца з уліку ў камітэце камсамола па месцы жыхарства і стаць на ўлік ва універсітэце. Тэрміны пастаноўкі на ўлік... Пастаноўка на ўлік праводзіцца ў ...».

Падумалася: якія малайцы! А я ламала галаву над гэтым складаным, як мне здавалася, пытаннем.

Потым, калі я крыху бліжэй пазнаёмілася з работай камітэта камсамола ў гэтым напрамку, я зразумела, што клопат і ўвага аб першакурсніку — заканамернасць, традыцыя. На кожным факультэце дзейнічае цэлы сектар «па першаму курсу», існуе цэлы план «тыдня першакурсніка» (які, праўда, вырашана расцягнуць на ўвесь першы семестр, таму што ні ў сем дзён, ні ў пяць раз па сем гэтыя мерапрыемствы проста немагчыма ўмясціць). Ёсць у плане і экскурсія ў музей універсітэта, і экскурсія па горадзе, і сустрэчы з «ветэранамі» СБА (не такі ўжо ён далёкі, трэці працоўны-85), і студэнцкі карнавал, і яшчэ нямала розных цікавых мерапрыемстваў.

Галоўны прынцып работы з першакурснікамі ў камітэце камсамола вызначылі так: «Першы курс нельга ўцягваць у грамадскую работу агульнай масай, даваць даручэнні адразу ўсім. Для першакурсніка ва універсітэце ўсё новае, ён павінен да ўсяго прыгледзецца, выбраць сваё, блізкае, цікавае, і вось ужо тут ён будзе прыносіць максімальную карысць».

У камітэце камсамола мне сказалі, што універсітэцкая бібліятэка, чыя работа часта выклікала нямала заўваг, таксама спланавала па-асобаму работу з першакурснікамі. Праводзяцца розныя азнаямленчыя гутаркі, у якасці эксперыменту для студэнтаў ФПМ у мінулым годзе была праведзена серыя практычных урокаў, прысвечаных уменню весці канспект, слухаць лекцыі, многаму іншаму, што непазбежна спатрэбіцца студэнту з першых дзён яго знаходжання ў ВНУ.

Заканчваецца першы семестр. За гэты час мы паспелі пазнаёміцца і з ФГП, і з актывам факультэта... Шмат чаго мы паспелі! Але без дапамогі камітэта камсамола было б, зразумела, цяжка.

**Д. МІНА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

## НАГЛЯДНАЙ АГІТАЦЫІ — КАНКРЭТНАСЦЬ, НАДЗЁННАСЦЬ

# БЕЗ СКІДАК НА ЎМОВЫ

У СКАРБОНЦЫ народнай мудрасці шмат крылатых выразаў. Сярод іх ёсць і такія: «Сто тысяч слоў не заменяць адной карцінкі», «Лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць». Яны, магчыма, не зусім дакладна, але вобразна раскрываюць ролю і значэнне наглядных сродкаў у выхаванні чалавека.

Наглядныя формы, ці то лаканічны лозунг, змястоўны стэнд, яркая «Маланка» або прыгожае пано, расказваюць людзям выразна, жыва і даходліва аб самых надзённых фактах і з'явах нашага жыцця.

Цяжка, дакладней, немагчыма сёння ўявіць ідэалагічную работу без розных сродкаў наглядней агітацыі, якія ўжо даўно знаходзяцца ў арсенале ідэйнай зброі нашай партыі. Удасканаленне сродкаў нагляднай агітацыі, павышэнне іх дзейснасці вызначаецца ўзроўнем партыйнага кіраўніцтва гэтым важным участкам ідэйна-выхаваўчай работы. Вельмі правільна паступаюць тыя партыйныя бюро факультэтаў, якія сістэматычна аналізуюць, як выкарыстоўваюцца магчымасці гэтых сродкаў бачнай інфармацыі ў камуністычным выхаванні моладзі, што робіцца для ўдасканалення іх форм і метадаў. Гэта дае добрыя практычныя вынікі.

Аднак магчымасці нагляднай агітацыі не на ўсіх факультэтах выкарыстоўваюцца ў поўнай меры. Часта наглядная агітацыя запознена рэагуе на надзённыя пытанні, вядзецца ў адрыве ад рэальнага жыцця, канкрэтных задач факультэтаў. У студэнцкіх інтэрнатах некалькі палепшыўся яе стан, аднак агітацыйна-выяўленчыя сродкі мала датычацца маральна-этычных праблем.

Неабходна адзначыць, што на многіх факультэтах сатырычныя формы нагляднасці не ў пашане, хоць шыльды з надпісамі «Народны кантроль», «Камсамольскі пражэктар», «Калючкі» тут ёсць. Ды толькі часта яны пустуюць. Між тым фактаў для сатырычных выпускаў можна знайсці дастаткова. Пропускі заняткаў, дрэнная паспяховасць — чым не тэмы для крытыкі, для выпуску сатырычных лісткоў?

Наглядная агітацыя павінна быць аператыўным памочнікам дэканатаў, партыйных бюро факультэтаў у стварэнні надзейнага заслону дрэннай паспяховасці і дысцыпліне.

Характэрна, што на пытанне, якой павінна быць наглядная агітацыя, самі студэнты адказваюць: менш агульных слоў, больш вастрыні, персанальнай крытыкі.

Адзін з асноўных абавязкаў партыйных бюро факультэтаў — павышэнне аўтарытэту добрасумленнай працы студэнтаў. І тут вялікая роля належыць агітацыйным сродкам. Найбольш папулярныя ў нашым універсітэце стэнды «Выдатнікі вучобы», «Гонар нашага факультэта». Але нярэдка яны афармляюцца невыразна, аднастайна: некалькі радоў статычных фотапартрэтаў, пад якімі стаяць толькі ініцыялы і прозвішча. Лепш, на наш погляд, калі выдатнікі будуць паказаны цікавымі рэпартажнымі фотазамалёўкамі непасрэдна на рабочых месцах: у лабараторыях, чытальных залах. Такі прыём «зніме» празмерную афіцыйнасць, узмоцніць эмацыянальнае ўздзеянне. Карысным было б раскрыць сакрэты выдатнай вучобы студэнтаў, прапагандуючы тым самым іх прыёмы і метады работы над кнігай і пераконваючы, што павышэнне якасці вучобы пад сілу многім.

Шырокае поле дзейнасці для арганізатараў нагляднай агітацыі — беражлівыя адносіны да грамадскай маёмасці. Актуальныя заклікі «Эканом ва ўсім!», «Беражы народнае дабро!» могуць застацца добрымі намерамі, калі не ўказаць дакладны адрас, дзе папсаваныя рабочыя сталы, дзе не эканомяць электраэнергіі і г. д. Без гэтага цяжка разлічваць на поспех нагляднай агітацыі ў барацьбе за эканомію і беражлівасць.

Інтарэсы справы патрабуюць лепш выкарыстоўваць наглядную агітацыю для забеспячэння галоснасці, параўнальнасці рэзультатаў сацыялістычнага спаборніцтва.

На жаль, далёка не ўсюды забяспечваецца дакладная накіраванасць і высокі мастацкі ўзровень нагляднай агітацыі. Існуе погляд, што чым ярчэй размаляваны «Маланка» ці які-небудзь плакат, тым ён лепшы. Але пагадзіцеся, што ва ўсякай справе патрэбна нейкая мера. Баявітасць і дзейснасць нагляднай агітацыі часта зніжаюцца з-за нясвоечасовага абнаўлення і непрадуманага размяшчэння матэрыялаў.

Нам патрэбна яшчэ больш развіваць і заахвочваць грамадскія пачаткі ў нагляднай агітацыі. Партыйнаму камітэту неабходна праяўляць больш клопату аб вучобе актывістаў гэтай справы, даваць ім канкрэтныя арыенціры, больш прынцыпова падыходзіць да правядзення аглядаў-конкурсаў сродкаў нагляднай агітацыі.

У сучасных умовах наглядную агітацыю неабходна падняць на больш высокі якасны ўзровень. Усямерна павышаць дзейснасць, канкрэтнасць. І рабіць гэта без усякіх скідак на ўмовы: недахоп часу, сродкаў, людзей і г. д. Сёння мы павінны выкарыстоўваць шматлікія магчымасці нагляднай агітацыі для адлюстравання жыцця факультэтаў напярэдадні XXVII з'езда КПСС, святкавання 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

**І. АРЭХОЎСКА...**
**член парткома універсітэт...**




*РАДАСЦЬ, ХВАЛЯВАННІ, клопаты... Наведаеш зараз любы корпус універсітэта, і адразу ўражвае нейкая незвычайная цішыня, якая штогод запаўняе аўдыторыі, холы, калідоры школы навукі ў студзені і чэрвені. Сесія!..*

*То там, то тут на дзвярах вучэбных аўдыторый прыцягваюць увагу аб'явы: «Цішэй. Ідуць экзамены!» Колькі хвалюючага ў гэтых словах! Вось прашпацыраваў хлопец з поўнай авоськай кніг. Можа сесія застала яго нечакана? А магчыма, з чыстым сумленнем ён ідзе здаваць у бібліятэку вывучаную на працягу семестра літаратуру? Спадзяёмся, што гэта так.*

*Хто быў студэнтам, той добра ведае хвалюючыя апошнія мінуты перад экзаменам, калі хочацца «вырваць» ненатуральным напружаннем мозгу яшчэ хоць крышачку так неаб-*





ЯК ЗНАЙСЦІ АБІТУРЫЕНТА

# КЛОПАТ АБ НОВЫМ ПАПАЎНЕННІ

ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ. Гэта добрая магчымасць дапамагчы будучым абітурыентам універсітэта правільна выбраць спецыяльнасць, якой прысвяціў бы ўсё жыццё і ніколі не расчараваўся. Вялікая роля ў гэтай справе адводзіцца выкладчыкам курсаў.

На жаль, нашы запыты на выкладчыцкія кадры факультэты не задавальняюць, хаця мы ў гэтым зацікаўлены (выкладчыкі універсітэта не толькі на высокім узроўні забяспечваюць выкладанне дысцыплін, але і паўсядзённа вядуць са слухачамі прафарыентацыйныя гутаркі).

Аднак усяго гэтага, на наш погляд, недастаткова. Патрэбна больш сістэматычная і мэтанакіраваная работа. У апошнія гады на курсах створаны розныя формы навучання. Гэта дазволіла павялічыць набор да 5000 слухачоў у год. Як правіла, з іх ва універсітэт падаюць заявы каля 2000 і толькі каля 1000 становяцца першакурснікамі.

Адміністрацыя і супрацоўнікі курсаў бачаць сваю галоўную задачу ў тым, каб найбольшая колькасць слухачоў паступала ва універсітэт. Для паспяховага вырашэння гэтай задачы неабходна разам з павышэннем узроўню вучэбна-выхаваўчай работы карэнным чынам палепшыць прафарыентацыю сярод слухачоў курсаў. Весці яе не эпізадычна, абмяжоўваючыся адной-дзвюма, хаця і кваліфікаванымі, гутаркамі прадстаўнікоў факультэтаў.

На ўсіх факультэтах ёсць адказныя за прафарыентацыйную работу. Ім неабходна наладзіць больш цесныя кантакты з курсамі, скласці сумесныя планы. На курсы прыйшлі людзі, якія жадаюць не толькі добра падрыхтавацца да паступлення ў БДУ. Ім цікава ведаць як мага больш аб сваёй будучай прафесіі, аб факультэтах наогул, аб умовах прыёму, аб конкурсах і прахадных балах.

Па кожнай спецыяльнасці ў нас ажыццяўляецца падрыхтоўка да паступлення ва універсітэт такой колькасці слухачоў, якая можа забяспечыць неабходны конкурс на ўсе факультэты. Але далёка не ўсе, хто вучыўся на курсах, паступаюць на абраную спецыяльнасць. Чаму? Па-першае, таму, што многія паступаюць у іншыя ВНУ Па-другое, таму, што некаторыя нікуды не паступаюць, не упэўнены ў сваіх сілах. Вось чаму так патрэбны больш сістэматычныя і цесныя кантакты прадстаўнікоў факультэтаў са слухачамі курсаў. У гэтым выпадку можна з упэўненасцю сказаць: вясной не патрэбна будзе, гаворачы мовай Грыбаедава, па абітурыента «ездить так далеко» і затрачваць на гэта вялікія сродкі.

Нам пажадана было б пераняць вопыт Днепрапятроўскага горнага інстытута, дзе створаны спецыяльны факультэт па прафарыентацыі на чале з дэканам. Пад яго кіраўніцтвам планамерна вядзецца гэта работа ўсімі факультэтамі. На працягу навучальнага года прафарыентацыйныя гутаркі супрацоўнікі інстытута неаднаразова праводзяць перш за ўсё на падрыхтоўчых курсах, з тымі будучымі абітурыентамі, якія ўжо абралі спецыяльнасць, прыйшлі ў ВНУ самі.

Хочацца спадзявацца, што ў БДУ імя У. І. Леніна сёлета прафарыентацыйная работа са слухачамі курсаў значна палепшыцца.

**А. ПАПЛЫКА,**
**дырэктар курсаў**
**па падрыхтоўцы**
**да паступлення ў БДУ.**

*ходных зараз ведаў. Але ж і цяжкая гэта работа!*

*А тут, прыпаўшы да замочнай шчыліны, нехта са студэнтаў-фізікаў старанна вывучае ўзаемаадносіны экзаменатара і свайго таварыша. Так, таварышу зараз нялёгка! Вельмі ўжо зацягнулася іх сустрэча.*

*Крыху воддаль сядзіць юнак. Магчыма, з паралельнай групы. Аб чым жа ён зараз думае? «З наступнага семестра вазьмуся за вучобу. Усё!..»,— крычаць стомленыя ад бяссонніцы вочы.*

*З вясёлым шумам выходзяць на вуліцу другакурснікі першай групы юрыдычнага факультэта. Яшчэ адзін экзамен паспяхова здадзены! Студэнты спадзяюцца пакінуць за сабой права называцца лепшай акадэмічнай групай універсітэта і ў гэтым годзе.*

*Сесія працягваецца... Ні пуху, ні пер'я, студэнт!*

***Фота і тэкст***
***А. ВАЛОШЫНА.***







СТУДЭНТ І НАВУКА

# ВЫСТУПІЛІ ПАСПЯХОВА

У СВЯРДЛОЎСКУ адбыўся III тур чацвёртай Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па правазнаўству. У камандзе Беларускай ССР (кіраўнік — дацэнт юрфака Г. А. Варабей) было тры студэнты юрыдычнага факультэта нашага універсітэта — А. Радчанка (3-ці курс), І. Більман (3-ці курс), І. Ждановіч (5-ы курс) і студэнт-юрыст з Гродзенскага універсітэта Я. Клейн (5-ы курс).

Усяго ўдзельнічала 14 каманд саюзных рэспублік, а таксама Масквы і Ленінграда.

Конкурсныя спаборніцтвы праходзілі на працягу двух дзён. У першы дзень былі прапанаваны заданні па трох прававых дысцыплінах, на другі — па дзвюх.

Каманда БССР выступіла паспяхова. Пераможцам алімпіяды стаў студэнт Гродзенскага універсітэта Я. Клей, які набраў лепшую суму балаў. Студэнтка юрфака нашага універсітэта І. Більман заняла другое месца па савецкаму дзяржаўнаму праву, А. Радчанка — трэцяе месца па савецкаму адміністрацыйнаму праву. Усяго каманда БССР атрымала 14 грамат, 8 з якіх — у студэнтаў БДУ.

У неафіцыйным заліку каманда Беларускай ССР, набраўшы 142 балы, заняла другое месца, перамогшы моцныя каманды РСФСР, Масквы, Ленінграда. А перамагла на алімпіядзе каманда Украіны.

Гэта ўжо не першае выдатнае выступленне студэнтаў-юрыстаў БДУ на такой алімпіядзе. Яны неаднаразова ўваходзілі ў лік прызёраў у камандным і асабістым заліку.

Паспяховае выступленне на такіх алімпіядах, безумоўна, паднімае прэстыж нашага універсітэта.

**М. ЧУДАКОЎ,**
**дацэнт юрыдычнага**
**факультэта.**

КААРДЫНАТЫ ПОШУКУ

# НА ВАСТРЫНІ ПРАБЛЕМЫ

**Калі ў студэнцкай аўдыторыі задаць пытанне: у якой групы людзей менш за ўсё вольнага часу, то рабяты, безумоўна, не раканаўча адкажуць: «У студэнтаў! У нас і лекцыі, і семінары, і «лабараторкі», і бібліятэка, і ...» Плюс да ўсяго НДР, дадам я, якой займаюцца, як правіла, у вольны ад лекцый час.**

НЕ САКРЭТ, што нават у салідным НДІ паміж вынаходніцтвам, зробленым на паперы, і вынаходніцтвам, укаранёным у практыку, стаяць часам гады. То ці ёсць сэнс студэнту затрачваць свае студэнцкія пяць гадоў на даследчую работу? Можа аддаць перавагу проста вучобе, літаратуры, тэатру?

**— Без СНТ студэнт не студэнт,— так лічыць пяцікурснік фізічнага факультэта Іван Прыходзька.**

Кафедра фізікі цвёрдага цела, дзе працуе Прыходзька, займаецца пытаннямі мікраэлектронікі, павышэння ўстойлівасці металаў да карозіі, атрымання матэрыялаў для ядзернай і тэрмаядзернай энергетыкі.

Дыпломны праект, якім ушчыльную заняты сёння Іван, упэўнена, будзе цікавым. Але як усякі дыплом, яго патрэбна яшчэ абараняць. Адно вядома дакладна: НДР дапамагла Івану, і можна быць упэўненым, што спецыяліст з яго атрымаецца.

Нядаўна ў Мінску праходзіла Усесаюзная навуковая канферэнцыя па пытаннях узаемадзеяння атамных часціц з цвёрдымі целамі. Удзельнік канферэнцыі пяцікурснік Іван Прыходзька выступаў з дакладам разам з вядомымі вучонымі нашай краіны.

**І. КЕЗІК,**
**студэнтка факультэта**
**журналістыкі.**

ТВОЙ ВОЛЬНЫ ЧАС — ТВАЁ БАГАЦЦЕ

# НЯМА АДПАЧЫНКУ ЛЕПШАГА...

МАГУТНЫ ТУ-144, набіраючы хуткасць, пайшоў на ўзлёт. Нарэшце можна адкінуцца ў крэсле і спакойна падумаць аб тым, што мы не паспелі зрабіць за час больш чым паўгадавых збораў. Мы — гэта дзевяць «незразумелых», на думку нашых бацькоў і знаёмых, людзей, якія ўжо шмат гадоў праводзяць свой вольны час з рукзаком за плячыма. Мы — гэта зусім розныя людзі, кожны са сваім колам інтарэсаў і захапленняў, якіх сабраў разам турызм. Чацвёра з нас: кіраўнік, кандыдат у майстры спорту С. Філімонаў, А. Кузьмін, О. Дзіжа і аўтар гэтых радкоў упершыню пайшлі разам у паход яшчэ студэнтамі хімічнага факультэта.

Самалёт адносіць нас усё далей ад роднай Беларусі, на далёкі Алтай, дзе мы збіраемся прайсці маршрутам пятай катэгорыі складанасці па ледніках і марэнах, перавалах і тайзе.

Не ведаем пра тое, што лёс нам рыхтуе падарунак у выглядзе невялікай крамы ў адзіным на нашым трохсоткіламетровым шляху населеным пункце — размешчаным у гарах маленькім пасёлку Аргут,— дзе мы купім вядро баранак (больш там нічога не будзе) і з'ядзім іх у той жа вечар ля вогнішча.

А горы і сапраўды поўныя нечаканасцей. У выніку не зусім добрага надвор'я ў гарах склалася павышаная селевая і лавінная небяспека. Яшчэ на дарозе ў пачатковы пункт маршруту наш аўтобус суткі прастаяў ля занесенага селем моста цераз невялікі ў звычайны час ручай Белы Бом.

І ўжо каторы раз горы правяраюць нас на стойкасць, вытрымку, і гэты раз мы павінны былі прайсці чарговую праверку і мы прайшлі яе. Бо ў цяжкую мінуту побач заўсёды акажацца таварыш, які абавязкова дапаможа. І яшчэ, нам заўсёды дапамагаюць (зразумела, у думках) нашы родныя і блізкія, якія з нецярпеннем чакаюць нас дома.

... Пройдзе год, і самалёт зноў панясе нас на сустрэчу ўжо, магчыма, з іншымі, але не менш цудоўнымі гарамі.

**Ю. ГРЫГОР'ЕЎ,**
**інжынер НДІ ФХП.**

музычны клуб
# КАМЕРТОН
БЕЛАРУСЬ

# ЯГО ВЯЛІКАСЦЬ ГУСТ

ПАПУЛЯРНАСЦЮ ў моладзі карыстаецца рок. А што можа рок-музыка? Адказ на гэта пытанне я знайшла не ў энцыклапедыі і не ў часопісе «Музыкальная жизнь», а ў часопісе... «Здоровье». На думку гэтага навукова-папулярнага выдання, рок мае некаторыя магчымасці. «У англійскім горадзе Саутпорт у графстве Ланкашыр на гарадскі храм мастацтваў, Кветкавую залу, звалілася няшчасце — у ім развялася вялікая колькасць мышэй. Знішчыць іх ніяк не ўдавалася — не дапамагалі ні пасткі, ні ядахімікаты, ні каты. І вось у зале адбыўся канцэрт сучаснай рок-музыкі. Электраакустычная апаратура ўзмацнення гуку дзейнічала безадказна. Прыхільнікі музычнага грукату вытрымалі. А вось мышы... бясследна зніклі».

Звернемся яшчэ да думкі медыкаў. Празмернасць дэцыбел і сучасны рытм музыкі, які супадае з альфа рытмам мозгу, аглушаюць і атупляюць чалавека, выклікаюць стан, блізкі да наркатычнага. А сёння дыскатэкі выкарыстоўваюць сродкі яшчэ большага ўздзеяння на псіхіку: тут і бесперапыннае мільганне ліхтароў, і палохаючыя ўспышкі страбаскопаў, дзе-нідзе ўжо і лазеры пускаюць...

«За сваю трыццацігадовую гісторыю рок не стварыў значных музычных каштоўнасцей»,— чытаем мы ў кнізе В. Т. Лісоўскага «Што значыць быць сучасным?». Зноў вечныя спрэчкі «бацькоў і дзяцей»? З'явілася новае пакаленне з новымі ўяўленнямі»,— як спяваецца ў адной сучаснай песні? Магчыма. Той, хто разумее музыку, хто чуе гармонію, а не акорды, той не будзе супрацьпастаўляць Моцарта і Уладзіміра Кузьміна. Як кнігалюб, напрыклад, не стане параўноўваць Л. Талстога і Ю. Сямёнава.

Напэўна, медыкаў напалохала дэманстрацыя тэхнічных сродкаў сучасных груп. Яны, самі таго не падазраючы, змагаюцца не толькі за наша здароўе, але і супраць безгустоўнасці ў року. Што і казаць, у многіх нашых музыкантаў сэнс схаваны за чыста знешнімі эфектамі. Дэманстрацыя тэхнічных сродкаў стала самамэтай, а прыёмы выканання адцягваюць увагу ад сутнасці.

Дарэчы, чаму зараз хутка раскупляюць пласцінкі Моцарта, Бетховена, Шапэна? Канцэртныя залы не змяшчаюць усіх жадаючых. Напэўна, узнікла патрэба ў псіхалагічнай глыбіні, інтымнасці, геніяльнасці, прастаце. Ці здолеем мы ў сваім маральным развіцці дарасці да такіх вяршынь чалавечага духу, як Моцарт і Вівальдзі, Чайкоўскі і Шапэн? Іх геній пераадолеў тую рысу, за якой ужо няма ацэнак «несучасна», а ёсць адзін крытэрый — вечнасць. Не дробязь гэта — адказваць за сапраўднасць сэнсу, які ўкладваецца ў паняцце «сучасны». Дапамагчы зразумець гэта здольны чулы, уважлівы, разумны **Яго Вялікасць Густ.**

Можна пагадзіцца з музычнымі крытыкамі, якія лічаць, што зараз рок-музыка перажывае перыяд застою. Ансамблі, якія прыйшлі на сцэну ў апошні час, нічога прынцыпова новага не прынеслі. Малаверагодна, што іх будуць слухаць праз дзесяць-пятнаццаць гадоў, як гэта адбываецца з «Бітлз» і «Ролінг Стоунз».

Аднак багатыя магчымасці року ніхто не адмаўляе. Узяць хаця б спектаклі з музыкай Аляксея Рыбнікава ў Маскоўскім тэатры імя Ленінскага камсамола — «Зорка і смерць Хаакіна Мур'еты» і «Юнона і Авось»... Гарманічная і рытмічная мовы класікі і рок-музыкі ўсё больш пераплятаюцца. Гаворачы аб рок-музыцы, нельга не прыпомніць і яе класіку — ансамбль «Бітлз». Джон Ленан, Пол Макартні, Джордж Харысан, Рынга Стар. Гэта вядомая «ліверпульская чацвёрка» заваявала ўвесь свет. «Бітлз» працягваюць пакараць слухачоў ужо многа гадоў пасля свайго распаду. Таленавітыя песні ансамбля сёння сучасныя ў поўным сэнсе гэтага слова. «Дайце свету шанс», «Улада — народу», «Уявіце сабе», «Шчаслівых каляд», «Вайна закончыцца» — у гэтых і іншых песнях «Бітлз» гучыць голас пратэсту супраць вайны, супраць прыгнёту працоўных, гучыць заклік да грамадзянскай мужнасці.

«Хопіць гэтых песень з бязглуздымі словамі. Паглядзіце, што робіцца навокал»,— сказаў яшчэ ў пачатку дзейнасці ансамбля яго кіраўнік Джон Ленан. І «Бітлз» спявалі: «Уявіце сабе — няма ўласнікаў, няма галодных і няма патрэбы забіваць... Уявіце — усе людзі жывуць дзеля міру».

... Гэта і ёсць той рок, які заслугоўвае ўвагі.

# Я ЛЮБЛЮ МУЗЫКУ

НЕХТА СКАЗАЎ: «Каб прыляцелі на зямлю жыхары іншай планеты і дадзена ім была ўсяго гадзіна на знаёмства з ёй, патрэбна было б сыграць ім «Лунную санату». Калі, абапіраючыся на гэта выказванне, спытаць: «З чаго пачаць размову аб музыцы?», то адказ будзе зразумелым і, на мой погляд, адзіна правільным: з музыкі, якая атрымала прызнанне многіх стагоддзяў, якая пакарыла людзей ужо за цэлыя эпохі да нашага нараджэння — з класікі.

Такім чынам, «Лунная саната» Бетховена.

...Ужо некалькі гадоў Бетховен заўважаў прыкметы пагаршэння слыху — страшэннае няшчасце для музыканта. Да хваробы слых у кампазітара быў на дзіва тонкі і дакладны. Але здароўе пагаршалася, і глухата стала відавочнай. Пакуты падаўлялі жыццярадаснасць.

У 1800 годзе ў Бетховена пачала браць урокі шаснаццацігадовая дзяўчына Жульета Гвічардзі. Яна любіла музыку, добра іграла на раялі, з лёгкасцю ўспрымала ўказанні кампазітара. У яе характары Бетховена прыцягвалі весялосць, гаварлівасць, таварыскасць. Ці была яна такой, як ён уяўляў яе сабе? Бетховен нейкі час не заўважаў у Жульеце лёгкадумнасці, лічачы яе вартай кахання, прымаючы прыгажосць яе твару за прыгажосць душы. Узнёслы, схільны да перабольшання вартасцей людзей, кампазітар пакахаў Жульету Гвічардзі. Але неажыццявімыя мары працягваліся нядоўга. Перашкодай з'яўляліся глухата Бетховена, яго матэрыяльная незабяспечнасць, арыстакратычнае паходжанне Жульеты.

Яму было тады трыццаць гадоў. Глухата азначала поўную адзіноту. Толькі творчасць магла вярнуць кампазітару веру ў сябе. Па адных паданнях Бетховен напісаў «Лунную санату» летам 1801 года ў Каромпе, у альтанцы парка, і таму санату пры жыцці кампазітара часам называлі «Санатай-альтанкай». Другія мяркуюць, што ён працаваў над санатай восенню таго ж года. Зімой з'явілася пасвячэнне Жульеце Гвічардзі «Луннай санаты» — сачыненне, у якім жыццё, творчасць, геній Бетховена зліліся разам, каб напісаць твор дзіўнай дасканаласці.

Першая частка — у павольным руху, у вольнай форме фантазіі. Пяшчота, журба, роздум. Споведзь пакутуючага чалавека. Выйсця няма. Навокал — спакой безнадзейнага адчаю. Аднак гэта толькі здаецца. Пасля першай часткі ўзнікае маленькі раздзел, які Бетховен назваў нейтральным словам Алегрэта, што ніяк не тлумачыць характар музыкі (італьянскі тэрмін «алегрэта» абазначае тэмп руху — умерана хуткі).

Што ўяўляе сабой гэта лірычная частка, якую Ферaнц Ліст назваў «кветкай паміж двума бяздоннямі»? Гэта пытанне дасюль хвалюе музыкантаў. Адны лічаць Алегрэта музычным партрэтам Жульеты, другія наогул устрымліваюцца ад тлумачэнняў загадкавай часткі.

Пасля Алегрэта — фінал санаты. Ён гучыць як бура, якая ўсё змятае са свайго шляху. Бушуе стыхія. Іншы раз здаецца, што надыходзіць поўнае абяссіленне, але чалавек зноў падымаецца, каб пераадолець пакуты. Веліч адчуваецца ў гэтай барацьбе чалавека з самім сабою. Фінал — галоўная частка санаты. Тут усё, як у жыцці, як здараецца ў многіх людзей, для якіх жыць — значыць змагацца, перамагаць пакуты.

Адна з цэнтральных ідэй творчасці Бетховена — здольнасць чалавека да пераадолення цяжкасцей, непахіснасць волі — знаходзіць увасабленне ў «Луннай санаце». Слухаючы гэты твор, мы апынаемся ва ўладзе ўзрыву, пратэсту, перамогі над бядой, мы імкнемся да актыўнага дзеяння. Напісаўшы санату, кампазітар нібы падвёў вынік значнаму этапу жыцця.

Пасля здрады Жульеты, якая выбрала замест яго бяздарнага кампазітара, графа Галенберга, Бетховен паехаў у маёнтак свайго сябра Марыі Эрдэ[illegible]. Ён шукаў адзіноты. Тры [illegible]ні блукаў па лесе, не вяртаючся дадому. Яго знайшлі ў ча[illegible]обе, абяссілеўшага ад го[illegible]аду. Ніводнай скаргі ніхто не [illegible]чуў. Бетховен нічога не расказва[illegible].

Усё было сказана музыкай...




# ПАНАРАМА

* ДРУГІ ДЖОН ЛЕНАН? Дваццацігадовы Джуліан вельмі падобны да бацькі. Але не толькі знешне. Пачуўшы ў яго выкананні песню «Я хачу пазбавіцца ад гэтага пачуцця», крытыкі прызналі, што сын атрымаў у спадчыну і музычны талент бацькі.

* * *

* «СПЭЙС», гэта значыць «Космас», быў і назвай, і асноўнай тэмай творчасці ансамбля, створанага ў 1977 годзе вядомым французскім спеваком Дзідзье Марцані. Ансамбль існаваў тры гады, выпусціў тры доўгаіграючыя пласцінкі і... змяніў арбіту. «Парыж — Францыя — транзіт» — так назваў Марцані новы састаў.

* * *

* ЧАТЫРЫ ГАДЫ назад у англійскіх музычных газетах з'явілася аб'ява: для выканання галоўных роляў у спектаклі «Бітламанія» патрабуюцца маладыя людзі, знешнасцю і голасам падобныя на «Бітлз». З мноства прэтэндэнтаў выбралі чатырох, і выбар аказаўся ўдалым. Пол Макартні, адзін з удзельнікаў ансамбля «Бітлз», паглядзеўшы спектакль, прызнаўся: «Гэта неверагодна, але сёння я бачыў на сцэне самога сябе». Выбраная чацвёрка (самі вялікія аматары «Бітлз») зараз выступае пад імем «Бутлег Бітлз» («Несапраўдныя Бітлз»).

* * *

* ПУПА (сапраўднае імя Энца Генаці, яму 30 гадоў) гаворыць на старонках італьянскага часопіса «Эуропео»: «Люблю рана класціся спаць. Ва ўсялякім разе, калі спіш, ні аб чым не думаеш». Так гаворыць, чароўна ўсміхаючыся, Пупа, і шматлікія аматары крычаць ад захаплення. Эстрадныя крытыкі, не падзяляючы такога энтузіязму, наракаюць на тое, што сваю любоў да сну Пупа з поспехам рэкламуе і ў часы, калі ён не спіць. «Навошта я слухаў гэтыя песні, чаму не лёг раней спаць?».

* * *

* «ПУДЗІС», «КАРАТ» і іншыя ансамблі ГДР набылі устойлівую еўрапейскую папулярнасць. З поспехам праходзяць і выступленні «Вір» («Мы»). Ансамбль створаны ў пачатку 70-х гадоў кампазітарам, гітарыстам і салістам Вольфгангам Цыглерам і з'арыентаваны на меладычныя, нескладаныя песні. У 1981 годзе музыка «Вір» стала больш рокавай. У 1983 годзе ансамбль гастраляваў у СССР.

# ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...

**Лячэбная сіла музыкі прызнавалася многімі старажытнымі народамі. Традыцыя лячэння музыкай, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне, захавалася...**

...У Старажытнай Індыі ўменне спяваць было адным з абавязкаў урача. Спецыяльныя (медыцынскія) песні, якія індусы-эскулапы выконвалі ў час прыёму хворых, служылі перш за ўсё для таго, каб прадэманстраваць упэўненасць яго ў сіле рамяства. І тым самым выклікаць у хворага давер.

... У адным з плямёнаў Усходняй Афрыкі доктар паяўляўся перад хворым з маленькім званочкам у руцэ. Пад мелодыю ўрач нараспеў дапытваўся аб сімптомах хваробы, а хворы, у сваю чаргу, павінен быў спяваць яму ў адказ. Лічылася, што такія спевы дуэтам садзейнічаюць выздараўленню.

У той час як урач, аглядаючы хворага, спяваў спецыяльную мелодыю, хор супляменнікаў цягнуў іншую песню, якая павінна была выгнаць хваробу з дому.

... У набор медыцынскіх прылад лекара, які дзейнічаў сярод абарыгенаў Аўстраліі, уваходзілі і музычныя інструменты. Імкнучыся вярнуць здароўе свайму пацыенту, урач дзейнічаў цэлым наборам дудак, кожная з якіх, на яго думку, здольна была сваімі гукамі перамагчы тую ці іншую хваробу.

**Матэрыялы «Камертона» да друку падрыхтавала студэнтка факультэта журналістыкі А. МАСЬКОВА.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

Зак. 2210. АТ 13042.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ